# Успамінаючы Настаўніка



**Раскажу вам пра Настаўніка. Імя якога ведаюць і памятаюць не толькі ў Пінкавічах і Пінскім раёне, не толькі ў Брэсцкай вобласці, але і ва ўсёй Беларусі. Гэта Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. Не чулі? А Андрэй Лабановіч? Так, так. Трылогія "На ростанях"... Малады настаўнік... Аўтабіяграфічны твор Якуба Коласа. Цяпер зразумела, аб кім ідзе гаворка?**

Малады настаўнік Канстанцін Міцкевіч (сапраўднае імя Якуба Коласа) у верасні 1904 года прыехаў працаваць у Пінкавіцкае народнае вучылішча. Так называлася школа таго часу. За плячыма юнака былі навучанне ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі і два гады працы ў вёсцы Люсіна ля Ганцавіч. Але ж няшчаснае каханне прымусіла шукаць новае месца працы. Так наш герой апынуўся ў Пінкавічах, дзе да гэтага часу жывуць аб ім успаміны. А на месцы той школы стаіць цяпер Народны літаратурна-краязнаўчы музей Якуба Коласа.

А як было ў тыя дні?
Прыехаў Колас на кані.
Азірнуўся ён наўкола і сказаў:
– Вось гэта школа!
Проста царскія палацы,
Вёскай як не любавацца.
Вунь – рака, а там – балота,
Вось – плантацыі чарота.
Толькі крок ступіў я першы,
А душа ўжо піша вершы.

Дваццаць вершаў з паметкай "Село Пинковичи" выйшла з-пад пяра паэта. Так пачыналася пінкавіцкая старонка ў біяграфіі нашага вялікага настаўніка.

Першае пытанне, з якім звярнуліся вучні да маладога педагога, было, на цяперашні час, незразумелае: "А Вы нас быты будэтэ?"

Для школы таго часу гэта тэма была актуальнай.

– Не, не буду, – адказаў малады настаўнік. – Толькі вы будзьце паслухмянымі.

Як любілі малыя пінкаўцы свайго настаўніка! А колькі ўрокаў дабрыні было выкладзена гэтым светлым, чулым і простым Чалавекам.

Сялянскім дзецям было вельмі цікава паглядзець, што ж робіць настаўнік дома. Ім здавалася, што ён не такі чалавек, як усе: не так ходзіць, не так спіць. І яны часта падыходзілі пад акно, стукалі і ўцякалі. Аднойчы ў зімовы вечар хлопчыкі пастукалі ў акенца, і Канстанцін Міхайлавіч іх заўважыў. Потым яшчэ раз пастукалі. Міцкевіч здагадаўся, што гэта былі яго вучні. Ён ціхенька выйшаў, абыйшоў будынак і злавіў хлопчыкаў. Як злякаліся дзеці! Падумалі, што настаўнік іх зараз наб'е, паставіць у кут ці раскажа бацькам.

– Што вы тут робіце? – спытаў настаўнік.

– Мы хотілі подывытыся, шчо вы смачнэ естэ, як вы дома одэваетэса... – на мясцовай гаворцы спужана прызнаваліся дзеці.

Канстанцін Міхайлавіч запрасіў іх у свой пакой, паказаў, дзе ён спіць, працуе, рыхтуецца да заняткаў. Напаіў дзяцей гарбатай. Назаўтра да настаўніка ў госці завітаў увесь клас.

А выпадак пра хлопчыка-сірату Алесіка... Бедна апрануты, мурзаты, вашывы. З ім ніхто не хацеў сябраваць і сядзець за партай. Канстанцін Міхайлавіч запрасіў яго прыйсці ў школу да заняткаў, вымыў яго, падрэзаў валасы, апрануў у новае адзенне, загадзя купленае ў Пінску. Дзеці нават не адразу пазналі "новага" вучня. Мала таго, загадаў дзецям на выхадныя дні па чарзе забіраць Алесіка дахаты.

Якія выдатныя веды перадаваў настаўнік малым палешукам! На іспытах у Жабчыцкім народным вучылішчы вучні Міцкевіча былі лепшымі. Ой, а як дабіраліся яны да тых Жабчыц! Дарога пясчаная, конь слабы. Злез тады з воза настаўнік і пайшоў пешшу.

Напрыканцы заняткаў вучні не спяшаліся пакідаць сваю "alma mater". "А давайтэ шчэ поспэваем", – прасілі дзеці. Стомлены, але задаволены настаўнік браў у рукі скрыпку, і лілася любімая ўсімі народная песня "Чаму ж мне не пець".

Можна доўга расказваць аб станоўчых рысах Коласа-настаўніка.

Заслугоўвае асаблівай увагі і яго работа ў соцыуме. Разам са старастам хадзіў класны кіраўнік па вёсцы з мэтай запрашэння ў школу дзяўчынак. Бо, як вядома, з сялянскіх сем'яў вучыліся ў асноўным толькі хлопчыкі. Але ж адказ амаль кожнай маці быў прыкладна такі: "Не, нэ оддам своіх дочэчок. Іх наука коло пэчы да за кроснамы. Бабья дорога – от пэчы до порога!" Толькі пару дзяўчынак з найбольш багатых сем'яў сталі наведваць школу.

Настаўніцкі дэвіз, з якім прыступіў да працы малады спецыяліст Міцкевіч: "Перада мною стаяла пачэсная і адказная задача – усімі сіламі, усім сэрцам служыць працоўнаму народу", быў ім поўнасцю рэалізаваны. Яго метады і прыёмы можна выкарыстоўваць для навучання будучых педагогаў. Дарэчы, у нашым народным літаратурна-краязнаўчым музеі Якуба Коласа захоўваюцца ўспаміны былых вучняў знакамітага настаўніка. А калі вы пажадаеце прайсціся пінкавіцкімі сцежкамі Коласа – дык, калі ласка, да нас у музей.

**Жанна ВЕРЫЧ, метадыст ДУА "Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі" Пінскага раёна, кіраўнік аб'яднання па інтарэсах юных экскурсаводаў "ГіД".**